ПРОЛЕТАРЫІ УСЁХ КРАЮН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЗАРА

орган Брэсцкага абкома КП(б)Б і аблвыканкома

№ 265 (337) | Чацвер 21 лістапада 1940 г. | Цана 10 кап.

249

Голас Л. Н. Талстога ў тонфільме

20 лістапада ў 30 гадавіну з дня смерці Л. Н. Талстога, па радыё ўпершыню транслёраваўся тонфільм, у якім увекавечан голас вялікага рускага пісьменніка. Тонфільм змяшчае некалькі пісем Л. Н. Талстога, яго прывітанне рэбятам Яснай Паляны і запісанае для іх-жа фанографам „Апавяданне аб чалавеку без ног". Перазапіс голаса Талстога са старых васковых валікаў на тонфільм зроблена ўпаўне здавальняюча. Тонфільм, якому прадпасланы каментарыі літаратурнага сакратара пісьменніка М. Н. Гусева і нарыс „Падарунак Эдысона" перадаваўся па ўсёй краіне. Вырашана голас Л. Н. Талстога запісаць на грамафонныя пласцінкі, якія будуць разасланы мясцовым радыёкамітэтам.

(ТАСС).

УЗНЯЦЬ ТЭМПЫ ЗАГАТОЎКІ І ВЫВАЗКІ ЛЕСУ

Дзевятнаццатага лістапада ў нашай газеце надрукавана пісьмо стаханаўскай брыгады лесарубаў Стаўбцоўскага леспрамгаса да ўсіх лесарубаў і возчыкаў Савецкай Беларусі. Вось што пішуць лесарубы:

„Нашай краіне патрэбен лес. Яго чакаюць вугальшчыкі Данбаса, гарнякі Крывога Рога, яго чакаюць лесапільныя, дрэваапрацоўчыя, хімічныя, запалкавыя прадпрыемствы, соцыялістычныя будоўлі. Гэты лес мы павінны даць, і мы яго дадзім".

Правільна разумеючы задачу, Стаўбцоўская брыгада лесарубаў дзеліцца вопытам сваёй работы, расказвае аб высокіх заробках, і абавязуецца да дня выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных загатовіць звыш плана 2.000 кубаметраў дроўнины і заклікае да гэтага ўсіх лесарубаў і возчыкаў рэспублікі. Гэтае пісьмо неабходна давесці да кожнага лесаруба і возчыка абласці і арганізаваць іх на выкананне гадавога плана загатоўкі і вывазкі лесу да дня выбараў у мясцовыя Саветы.

Па лесазагатоўцы і лесавывазцы наша абласць вельмі адстала. Гадавы план за 10 мінулых месяцаў выкананы: па загатоўцы лесу на 58,6 процанта і па вывазцы на 54,7 процанта. Асабліва нездавальняюча абстаіць справа з лесазагатоўкамі і вывазкамі ў Бярозаўскім і Косаўскім раёнах. Бярозаўскі раён выканаў план лесазагатоўкі на 31,4 процанта і вывазкі на 42,9 процанта. Косаўскі раён адпаведна на 34,1 проц. і на 46,5 проц.

Адставанне Бярозаўскага, Косаўскага і рада іншых раёнаў ёсць результат таго, што іх кіраўнікі не ўлічылі гаспадарча-палітычнага значэння своечасовага выканання планаў лесазагатовак і лесавывазак, і пусцілі справу на самацёк.

Карыстаючыся бескантрольнасцю з боку райкомаў і райвыканкомаў, дырэктары Косаўскага і Іванавіцкага леспрамгасаў тт. Мамонаў і Янушка, якія вядуць лесазагатоўку на тэрыторыі Косаўскага і Бярозаўскага раёнаў, дрэнна арганізавалі вярбоўку і замацаванне на рабоце лесарубаў і лесавозчыкаў, дапусцілі велізарную запазычанасць па разліках за лесараспрацоўку, чакалі, каб райкомы партыі прыслалі ім рабочую сілу. Вось гэта і прывяло да адставання. Калі-б райкомы партыі і райвыканкомы кантраліравалі работу леспрамгасаў, патрабавалі адказнасці ў дырэктараў за даручаную справу, то планы лесавывазак і лесазагатовак былі-б выкананы своечасова.

Поспех ва ўсякай нашай рабоце вырашаюць жывыя людзі, кадры. Дзе кадры кіруючых работнікаў стараюцца работаць, там і поспех заваёўваецца. Не гледзячы на тое, што планы лесазагатоўкі і лесавывазкі ў Ружанскім і Гайнаўскім раёнах значна большыя ў параўнанні з іншымі раёнамі, усё-ж яны дабіліся і вышэйшага процанту выканання. У гэтых раёнах справе лесазагатовак удзяляецца большая ўвага.

Па Ружанскаму раёну гадавы план загатоўкі лесу выкананы на 62,9 процанта, вывазкі — на 77 процантаў. Па Гайнаўскаму раёну гадавы план загатоўкі лесу выкананы на 62,8 процанта і вывазкі — на 67,2 процанта.

Маларыцкі раён перавыканаў гадавы план вывазкі лесу і тым самым забяспечыў датэрміновае выкананне гадавога плана лесавывазкі па ўсяму Брэсцкаму леспрамгасу. Калі работу выконваць, то яна будзе відна.

Стаўбцоўскія лесарубы-стаханаўцы расказваюць у сваім пісьме, што поспех іх работы заключаецца ў брыгадным метадзе. Гэты метад трэба ўкараніць у работу нашых лесарубаў. Стаханаўскай работай узняць тэмпы лесазагатоўкі і лесавывазкі.

Зараз амаль закончаны ўсе летне-асенніх сельскагаспадарчыя работы. У кожнай вёсцы вызваліліся многа рабочай сілы. Неабходна зараз арганізаваць масавы выхад сялян на лесараспрацоўкі і вывазкі з такім разлікам, каб выканаць план па кожнаму раёну датэрмінова да дня выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных.

Кожны раён мае магчымасць у бліжэйшыя дні ліквідаваць адставанне і дабіцца выканання планаў лесазагатоўкі і вывазкі. Для гэтага трэба арганізаваць працу лесарубаў і возчыкаў, разгарнуць сярод іх соцыялістычнае спаборніцтва і стаханаўскі рух, наладзіць забеспячэнне іх прадуктамі і промтаварамі, своечасова вытвараць разлік за работу, адзначаць лепшых людзей.

Прызыў у рамесленыя і чыгуначныя вучылішчы і школы фабрычна-заводскага абучэння

СТО ЗАЯЎ НА 60 МЕСЦ

Пачала работу Высокаўская раённая камісія па прызыву моладзі ў чыгуначныя і рамесленыя вучылішчы і школы фабрычна-заводскага абучэння.

На прызыўным пункце ажыўленне. Сюды сабралася моладзь пяці сельсаветаў. Гэта выключна добраахвотныя — дзеці калгаснікаў, рабочых, сялян.

Па раёну патрэбна прызваць 60 чалавек — 10 у рамесленыя вучылішчы і 50 у школы ФЗА. Добраахвотна падалі заявы больш 100 юнакоў.

Юнакі праходзяць медыцынскі агляд. Да стала камісіі падыходзяць дзеці калгаснікаў з калгаса „17 верасня" Іваноў Дзмітрый, Баламута Пётр, Веремюк Нікалай. Раней для іх былі закрыты дзверы навучальных устаноў. Савецкая ўлада прадаставіла для іх магчымасць бясплатна набыць прафесіі.

Жаданне маладых калгаснікаў паступіць у школу фабрычна-заводскага абучэння камісіяй задаволена. З вялікай радасцю выходзяць яны з памяшкання прызыўнога пункта. Чакаючыя чаргі рэбяты з зайздрасцю глядзяць на шчасліўцаў.

15-гадовы Годунюк Нікалай, сын удавы з Расняноскага сельсавета, хвалюючыся, чакае рашэння камісіі. Нялёгка жылося яму пры панскай уладзе. Паўтара гектара зямлі, адна карова, развалепая хатка, вось усё, што мелі яго бацькі. Нікалай наймаўся да кулакоў у пастухі і не мог марыць аб навуцы.

— Пойдзеш у рамесленае вучылішча? — пытае старшыня камісіі тав. Красінкоў.

— Так, адказвае юнак, — буду добрасумленна вучыцца.

Плеценюка Пятра і Хавалко Пятра з Волчынскага сельсавета камісія таксама залічвае ў рамесленыя вучылішчы.

За два дні работы камісіяй адабрана 30 чалавек, з якіх 10 у рамесленыя вучылішчы і 20 у школы ФЗА.

Н. Лагвінюк.

На сходзе членаў арцелі

Кобрын. (Па тэлефону) 19 лістапада адбыўся агульны сход членаў арцелі „Соцыялістычная праца", на якім вылучаліся кандыдаты ў дэпутаты Кобрынскага гарадскога совета.

Член арцелі тав. Міно на роднай мурэйскай мове гаворыць пра вялікія правы совецкіх грамадзян і прапануе вылучыць кандыдатам у дэпутаты гарадскога совета старшыню арцелі тав. Мантака. Сход аднадушна падтрымлівае вылучаную кандыдатуру.

Тав. Берасняк і тав. Айзенштейн прапануюць вылучыць кандыдатам у дэпутаты гарадскога совета лепшую стахановку арцелі тав. Кенцупер і народную суддзю Энціна. Сход адкрытым галасаваннем падтрымлівае гэтыя кандыдатуры. Тут-жа абраны даверанныя асобы.

В. Хмялеўскі,
А. Пытлык,
С. Катоўскі.

Падрыхтоўка да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных

Комсамольцы-актывісты выбарчай кампаніі

На Крыніцкім выбарчым участку Шэрашэўскага раёна былі своечасова вывешаны спісы выбаршчыкаў. Яны саставлены чыста і акуратна без адзінай памаркі. У складанні спісаў дапамагалі комсамольцы.

Комсамольская арганізацыя сельсавета актыўна ўключылася ў выбарчую кампанію. Да акруг па выбарах у сельскі Совет прымацаваны комсамольцы Рабчук Софія, Рабчук Вера, Новік Аляксандра, Рабчук Аркадій, Клімен Нікалай і Крывабалоцкі Васіль. Гэтыя таварышы праводзяць на ўчастках вялікую масава-растлумачальную работу сярод выбаршчыкаў, расказваюць аб кандыдатах сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

А. Рабчук.

Калгас імені Сталіна, Шэрашэўскага раёна.

Вылучаюць дастойных людзей

18 лістапада вечарам у клубе дзяржгандлю адбыўся прадвыбарчы сход работнікаў міжрайгандлю, на якім вылучаліся кандыдаты ў дэпутаты гарадскога Совета.

Калектыў міжрайгандлю вылучыў кандыдатам у дэпутаты гарадскога совета тав. Пугача. І калі слухаеш яго расказ аб жыццёвым шляху, у памяці паўстае малюнак цяжкага мінулага гэтага таварыша.

Сын селяніна-бедняка, ён з малых год пайшоў працаваць да памешчыкаў і кулакоў, адчуў на сабе эксплаатацыю і зняволенне.

У 1931 годзе тав. Пугач быў пасаджан у турму за рэвалюцыйную дзейнасць. Пасля адбыцця пакарання ён працягваў падпольную работу. Тав. Пугач адзін з першых арганізаваў сялян для аказання дапамогі Чырвонай Арміі ў разгроме белапольскіх банд.

— Я вельмі рад заявіў тав. Пугач, што не дарма лепшыя сыны народа патрацілі многа сіл і жыцця для лепшага будучага іх братоў і дзацей. Мне давяраюць быць прадстаўніком ад народа ў органах совецкай улады — гэта вялікі гонар, які я апраўдаю.

На гэтым-жа сходзе вылучылі кандыдатамі ў дэпутаты ў гарадскі совет лепшых людзей гандлю тав. Леванюк, Калядыцкую, Шлінькі і Баранава.

Дзешкуноў.

Наш кандыдат

Імя Канстанціна Дзем'янавіча Талочка шырока вядома не толькі ў Івацевічах, дзе аднадушна на зваліі яго сваім кандыдатам у абласны Совет дэпутатаў працоўных. Землякі з вёскі Подстарынь, дзе жыў і работаў тав. Талочка, з нескрываемай радасцю і гордасцю падтрымалі рашэнне рабочых Івацевіцкага завода № 15, вылучыўшы Талочка кандыдатам у дэпутаты.

Сяляне навакольных вёсак памятаюць яго ўмелым арганізатарам вялікіх дэманстрацый у дні рэвалюцыйных свят у былой панскай Польшчы. Ведаюць аб самігадовым турэмным заключэнні, якое не зламіла яго волі.

З першых дзён прыходу Чырвонай Арміі Канстанцін Дзем'янавіч весь аддаўся вялікай творчай рабоце па перабудове жыцця працоўнага народа. Ён дзейсна дапамагае ў рэканструкцыі прадпрыемстваў пасёлка, размяркоўвае панскую зямлю і жывёлу бедакам і батракам. І заўсёды пры гэтым праяўляе сапраўдную большавіцкую чуласць, хаця і з'яўляецца беспартыйным.

Усё яго жыццё, інтарэсы, дзейнасць — яскравы доказ таму, што гэты чалавек можа быць сапраўдным слугой народа. За кароткі тэрмін яго работы старшынёй пасялковага совета ў Івацевічах былі адкрыты дзве бальніцы, дзіцячы [illegible] бібліятэка, дабудоўваюцца [illegible] чыя школі, многа дамоў [illegible]ры.

З пэўнай упэўненасцю мы, выборшчыкі, можам сказаць, што [illegible] К. Д. Та[illegible] адданай работай.

[illegible]: В. Хмялеўскі,
А. Пытлык,
С. Катоўскі.

Пачалася агітацыя за кандыдатаў

Агітацыйную работу на Мілейкаўскім выбарчым участку Альбінскага сельсавета рэгулярна праводзяць у сваіх гуртках 14 агітатараў. Найбольшым поспехам карыстаецца агітатар Екацярына Пархута, сялянка сяла Мілейкі. На заняткі яе гурткі лепшае наведванне. З 31 чалавек на заняткі з'яўляюцца 34 — 35.

Умела праводзіць агітацыйную работу і тав. Пескун. Агітатары заключылі паміж сабой соцыялістычнае спаборніцтва на лепшую пастаноўку прадвыбарчай агітацыі.

Усе агітатары разгарнулі агітацыю за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. Яны падрабязна расказваюць біяграфіі кандыдатаў, іх дзейнасць.

Побач з перадавымі гурткамі ёсць і такія, дзе наведванне заняткаў выбаршчыкамі недастатковае. У гуртках агітатараў Галабурды з вёскі Лазовічы і Каспяровіча з вёскі Жомойдзякі выбаршчыкі дрэнна наведваюць заняткі. Гэтым агітатарам растлумачана, як трэба лепш арганізаваць работу, каб выклікаць зацікаўленасць выбаршчыкаў да праводзімых гутарак у гуртках.

На ўчастку арганізавана праверка спісаў выбаршчыкаў. Тут устаноўлены дзяжурныя членаў выбарчай камісіі.

В. Гаравой,
даверан па Мілейкаўскаму выбарчаму ўчастку.

Штодзённа правяраць якасць агітацыйнай работы

Наш агіткалектыў аб'ядноўвае 20 агітатараў, а іх частка таварышоў не кіруе самастойна гурткамі, а дапамагае ў рабоце другім агітатарам.

Па нашаму ўчастку створаны 14 гурткоў, у якіх займаюцца 317 выбаршчыкаў, у асноўным — жанчыны гаспадыні. Значная частка выбаршчыкаў — рабочых і служачых абслугоўваецца па месцу работы.

Гурткі працуюць па плану, заняткі праводзяцца па два разы ў тыдзень. Акрамя вывучэння выбарчага закона і Сталінскай Канстытуцыі, нашы агітатары знаёмяць выбаршчыкаў з асобнымі раздзеламі даклада таварыша Сталіна на XVIII з'ездзе ВКП(б) і дакладам та[illegible] Калініна на сходзе [illegible] партактыва г. Масквы [illegible] отычным выхаванні. [illegible] агітатар кар[illegible]

[illegible]

[illegible]

Самі па[illegible] маш[illegible]ком мала [illegible] забяспечылі [illegible] іх [illegible]овятленнем. У [illegible] ўсёй рабоце, ве[illegible] залася шчыль[illegible] агітатарамі, уз[illegible]

Агітатары з[illegible] турай, праводзім з імі семінары, нарады. Але поспех вырашае самастойная работа агітатара па падрыхтоўцы да заняткаў. З пачатку сваёй работы па ўчастку я ўсталяваў кантроль над якасцю праводзімых гутарак. У гэтым мне дапамагаюць члены ўчастковай выбарчай камісіі. Наведваючы заняткі гурткоў, своечасова заўважаем недахопы і памылкі агітатара, каб нахаду іх выпраўляць. Адзін агітатар, які сістэматычна прыходзіў на заняткі не падрыхтаваным, быў заменен. Другому агітатару, які працуе старанна але не мае патрэбнага вопыту, мы далі ў дапамогу двух таварышоў.

Добра паладзілі работу ў гуртках агітатары тт. Шчэрбіч і Фрайман. Іх гуткі насычаны мясцовымі фактамі, мова ў іх — жывая, даходчывая. Карыстаюцца ўмела геаграфічнымі картамі, дыяграмамі. На адным з заняткаў яны жыва расказалі аб такім блізкім працоўным Кобрына пабудаванні як Дняпра-Бугскі канал. Тут-жа яны прадэманстравалі чарцёж канала. „Сакрэт" поспехаў гэтых агітатараў просты: яны добрасумленна [illegible]цца да заняткаў.

[illegible]шай р[illegible] стары багам[illegible] [illegible]цц[illegible] нарадах агітатараў падаем вопыт работы, крытыкуем работу асобных таварышоў.

[illegible]рыступаем да агітацыі за [illegible]іграваных кандыдатаў. Агі[illegible] забяспечваюцца матэрыя[illegible] для гэтай работы. Як адну з [illegible]сных форм скарыстаем для [illegible]ацыі за кандыдатаў насценныя [illegible]еты пры кожнай выбарчай [illegible]крузе. У гэтых газетах, якія на[illegible]ваюцца „Голас выбаршчыкаў", самі выбаршчыкі будуць агітаваць за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

А. І. Леснаў,
кіраўнік агіткалектыва Беларускага выбарчага ўчастка г. Кобрын.

Кандыдаты вёскі Сінковічы

Днямі ў нашай вёсцы адбыўся прадвыбарчы сход, на якім сяляне вылучалі кандыдатаў у дэпутаты сельскага Совета дэпутатаў працоўных.

Вёска разбіта на 7 выбарчых акруг па выбарах у сельскі совет. На сходзе сяляне аднадушна вылучылі 7 кандыдатаў: т. т. Крыўша, Шелеста, Бзепчука, Вашейко, Шашука, Фядосіка і Вараб'я. Гэтыя таварышы з'яўляюцца перадавымі людзьмі нашага сельсовета.

І. Л. Лаўрынчук.

Вольш 40 рабочых машынабудаўнічага завода „Красный Крулль" у Таліне (Эстонская ССР) зараз работаюць камісарамі прадпрыемстваў і на адказнай партыйнай і совецкай рабоце.

Партыйная і комсамольская арганізацыі завода з'яўляюцца лепшымі ў Таліне па арганізацыі палітычнай работы. У іх рады ўступаюць лепшыя людзі прадпрыемства.

Справа налева: член камітэта комсамола А. Руккі, сакратар камітэта А. Лутс і член камітэта В. Острат гутараць з прымаемым у комсамол токарам Р. Раатт.

Фота Н. Янава. *Фота ТАСС.*

Прадвыбарчыя сходы ў Гайнаўскім раёне

Ужо некалькі дзён у раёне праходзяць прадвыбарчыя сходы па вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты сельскіх і гарадскога совета.

18 лістапада адбыўся сход рабочых біржы сыравіны завода імені Варашылава. Выступіўшы на сходзе рабочы тав. Юдчук сказаў:

— Калектыў завода добра ведае тав. Керноўскага, як аднаго з лепшых нашых стаханаўцаў, і я прапаную вылучыць яго кандыдатам у дэпутаты гарадскога совета. Прапанову тав. Юдчука падтрымаў увесь калектыў і ён быў аднадушна вылучан кандыдатам у дэпутаты Гайнаўскага гарадскога совета.

Прадвыбарчыя сходы адбыліся ў Арэшкаўскім, Чажоўскім і Старакорнінскім сельсаветах. Сяляне вёскі Махнатае вылучылі кандыдатамі ў дэпутаты сельскага совета старшыню Старакорнінскага сельсавета тав. Кот Канстанціна і сялянку Кучко Аксінню.

На многалюдным сходзе ў вёсцы Арэшкава вылучана кандыдатам у дэпутаты сельскага совета настаўніца Волкавыцкая Аляксандра і сялянін-актывіст Чурак Нікіта і Парфінюк Якаў.

Ф. Кавалёў.

У Сяхновіцкім сельсавеце

Жабінка. Шырока разгарнулася агітацыйная работа ў Сяхновіцкім сельсавеце. На двух выбарчых участках — Мацеевіцкім і Сяхновіцкім працуе 35 агітатараў з мясцовага актыва. Яны правод[illegible] ў гуртках па вывучэнню [illegible]Іноскай Канстытуцыі [illegible] аб выбарах, агітуюць [illegible]таў сталінскага блока [illegible]ыкаў і беспартыйных. Добра працуюць агітатары тт. Доўгалюк Парфенцій з вёскі Грыцевічы, Пушкевіч Нікалай з вёскі Ханькі і др. Выбаршчыкі праяўляюць вялікую актыўнасць у час заняткаў у гуртках.

Зараз у вёсках праходзіць вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты сельскага Совета. Ужо вылучана 12 чалавек. Сярод іх селянін-бедняк вёскі Сямёнаўцы Герасім Васільевіч Лось, актывіст вёскі Заяры А. Ц. Шершуновіч і О. П. Вішнеўскі.

Працоўны[illegible] сустрэць дзе[illegible] выкананнем у[illegible] перад дзяр[illegible] выканан пл[illegible] заканчваецц[illegible] шовых пла[illegible] таў унесень[illegible] на пазыку [illegible] дуси трэба [illegible].

І. Лотт.

На Чкалаўскім выбарчым участку

Днямі ў памяшканні абласнога ўпраўлення кінофікацыі адбылася нарада — семінар агітатараў Чкалаўскага выбарчага ўчастка.

Даверана тав. Козін яснa і зразумела расказаў агітатарам аб выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных. Лепшыя агітатары абменяліся вопытам сваёй работы.

У выбарчых акругах № 61, 62, 68, 69, 70, 71 арганізаваны і рэгулярна працуюць гурткі па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах.

Пасля нарады для агітатараў былі прадэманстрыраваны кінофільмы „Прамова таварыша Сталіна на прадвыбарчым сходзе выбаршчыкаў Сталінскай выбарчай акругі горада Масквы", „Прамова таварыша Молатава перад выбаршчыкамі Молатаўскай выбарчай акругі гор. Масквы". Фільмы пакінулі ў гледачоў глыбокае ўражанне.

Па плану работы ўчасткавай камісіі, 19 лістапада ў памяшканні школы № 1 для выбаршчыкаў 17 Чкалаўскай выбарчай акругі будуць прадэманстрыраваны гэтыя фільмы. 24 лістапада ў памяшканні гэртэатра адбудзецца сход выбаршчыкаў трох акруг па сустрэчы з кандыдатам у дэпутаты у абласны Совет тав. Рашчынскім.

М. В. Левін,
намеснік старшыні 62 выбарчай акругі.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

Сістэматычна правяраць выкананне

Рашэннем Брэсцкага райкома КП(б)Б паўтара месяца таму назад арганізавана пярвічная партыйная арганізацыя пры Рэчыцкай пяцігадовай-сярэдняй школе. Сакратаром партарганізацыі выбран тав. Шышкін.

Уся работа партарганізацыі праводзіцца па плану. За прайшоўшы перыяд праведзена пяць партыйных сходаў, на якіх было разгледжана рад важнейшых пытанняў: аб пастаноўцы выхаваўчай работы ў школе, ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці сярод насельніцтва, арганізацыі пярвічнай комсамольскай арганізацыі пры сельсавеце, удзел комуністаў у выбарчай кампаніі і г. д.

26 кастрычніка на адкрытым партыйным сходзе прысутнічала 30 чалавек беспартыйнага актыва сельсавета, якія прынялі ўдзел у абмеркаванні пытанняў, сталых на павестцы дня.

Комуністы Паўлоўская і Федзіпына сістэматычна праводзяць заняткі ў гуртках па вывучэнню з выбаршчыкамі Сталінскай Канстытуцыі і выбарчага закона. Тав. Паўлоўская працуе намеснікам старшыні ўчастковай выбарчай камісіі.

Пярвічная партарганізацыя ажыццяўляе сістэматычную дапамогу сельсавету па выкананню мясцовага актыва і ў правядзенні ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній.

Партарганізацыя праз калектыў агітатараў, які налічвае 30 чалавек, праводзіць вялікую масава-агітацыйную і растлумачальную работу сярод насельніцтва і ўмацняе яе ў звязку з выбарамі ў мясцовыя Саветы депутатаў працоўных.

Агітатары Мусенек, Пракапюк Балеслаў, Назарук Іван і другія добра праводзяць агітацыйную работу на польскай мове сярод выбаршчыкаў, да якіх яны прымацаваны. Настаўнікі Мароз Барыс і Шышук Пётр таксама добра арганізавалі растлумачэнне выбаршчыкам Палажэння аб выбарах у мясцовыя Саветы депутатаў працоўных.

Аднак у пастаноўцы агітацыйнай работы сярод насельніцтва яшчэ ёсць рад істотных недахопаў. Слаба разгортваецца агітацыйная работа сярод польскага насельніцтва, якое пераважае ў гэтым сельсавеце, на яго роднай мове. Яўна недастаткова пастаўлена агітацыя за выстаўленых кандыдатаў.

Не наладжана работа хаты-чытальні, адсутнічаюць газеты, літаратура на польскай мове. Не забяспечана хата-чытальня апаламі і асвятленнем. Мала выпісваецца газет. Не арганізаван выпуск насценнай газеты.

Гэтыя недахопы маюць месца таму, што ў партарганізацыі не наладжан кантроль і праверка выканання, як важнейшы сродак барацьбы за ўзорную пастаноўку партыйна-масавай работы ў арганізацыі. У сувязі з гэтым прынятыя рашэнні не выконваюцца. Так да сёнешняга дня нічога не зроблена па выкананню пастановы партхода аб ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці сярод насельніцтва. Не выканана рашэнне і па арганізацыі пярвічнай комсамольскай арганізацыі.

У школе ёсць факт парушэння прапоўнай дысцыпліны. Настаўніца-комсамолка тав. Суртова два разы спазнялася на работу. Парушэнне працоўнай дысцыпліны ёсць і ў сельпо сярод асобных служачых, а партарганізацыя недастаткова займаецца гэтым пытаннем.

Ліквідацыяй усіх гэтых недахопаў партарганізацыя яшчэ больш уздыме сваё значэнне і аўтарытэт сярод працоўных мас. Брэсцкі райком партыі павінен удзяліць ёй максімум увагі ў наладжванні партыйна-масавай і палітычнай работы.

М. Гурэвіч.

Рэзультат бяспланавай работы

Днямі адбыўся сход пярвічнай партарганізацыі Бароваўскага райвыканкома. Быў заслуханы даклад сакратара партарганізацыі т. Янчэўскага аб праробленай рабоце па выкананню пастановы справаздачна-выбарчага сходу.

З даклада тав. Янчэўскага высветлілася, што з красавіка месяца адбылося 8 партыйных сходаў, якія праводзіліся без усякай папярэдняй падрыхтоўкі. Плана работы не было.

На першым партыйным сходзе выбіралі делегатаў на райпартканферэнцыю, на другім—выбары сакратара партарганізацыі, на трэцім—таксама выбары сакратара і слухалі даклад былога сакратара т. Тюрыкава. Праз некаторы час зноў выбіралі сакратара партарганізацыі.

На пятым сходзе была разгледжана справа аб пав[illegible] комуністаў Канап[illegible], якія парушы[illegible] думка Вярхоўнага [illegible] прапоўнай дысцы[illegible] прыкладна ўсё, што [illegible] сакратар партарганізацыі аб пра[illegible]леным рабоце за справаздачны перыяд.

Праўда, многія комуністы выканывалі даручэнні райкома партыі. Пяць комуністаў гэтай арганізацыі працуюць кіраўнікамі калгаскалектываў у сельсаветах. Але некаторыя з іх, як Астапчук, Мікуцкаў, да апошняга часу безадказна адносіліся да даручанай [illegible] справы. Зусім мала звярталі ўвагі на работу з агітатарамі.

У адным з рашэнняў агульна[illegible] партыйнага сходу [illegible]лісана: [illegible] при райвыканкоме [illegible] выпуск насценнай газеты. Аднак гэта рашэнне засталося не выкананым і на сёнешні дзень. Сакратар партарганізацыі т. Янчэўскі з ухмылкай гаворыць: „Я даручыў гэту справу комсамольцу тав. Валенкову, а ён прызван у Чырвоную Армію, так газета і не выходзіць“.

У партарганізацыі справа партыйнай вучобы знаходзіцца на нізкім узроўні. У маі месяцы райком КП(б)Б заслухаў даклад сакратара партарганізацыі аб становішчы партыйнай прапаганды і абавязаў яго штодзённа кіраваць справай прапаганды. Але тав. Янчэўскі сам не вывучае „Кароткага курса гісторыі ВКП(б)“ і не патрабуе ад комуністаў настойнай работы па павышэнню свайго тэарэтычнага ўзроўню.

Больш таго, т. Янчэўскі нават на партыйным сходзе не паказаў сапраўднага становішча партыйнай арганізацыі. Ён гаварыў, што ўсе комуністы вывучаюць гісторыю партыі, але марудна. — Вось і я ўсё яшчэ вывучаю другі раздзел.

Правільней было-б сказаць, што члены гэтай партарганізацыі не вывучаюць гісторыю партыі, не работаюць над авалодваннем марксісцка-ленінскай тэорыяй. Вось факты. Па словах сакратара партарганізацыі, комуністы Краўченка (заг. планавым аддзелам РВК), Кухаренка (старшыня РВК) вывучаюць другі раздзел, т. Ас[illegible] раздзел, а фак[illegible] не вывучаюць [illegible] сакратар [illegible]

[illegible] пленнях комі[illegible]тыкавалі такі[illegible]оты, і ў пры[illegible]амецілі прак[illegible]ствы для нала[illegible]ння справы, для ўстанаўлення праверкі і кантроля па выкананню рашэнняў.

М. Гурчонак.

Комсамолкі в. Хорава, Пружанскага р[illegible] Маня Новік (злева) і Маня Валю[illegible]ка, першымі ў вёсцы здалі нормы на значок ГПХА

Фота В. Лупейка.

Сустрэча з кандыдатам

Вестка аб тым, што ў Ружаны прыбыў кандыдат у депутаты абласнога Совета тав. Сяргееў, хутка абляцела ўсе цэхі Ружанскага райпромкамбіната. Роўна ў 6 гадзін вечара рабочыя і служачыя сабраліся ў свой чырвоны куток.

Даверана тав. Мальцер адкрыў сход. Слова прадастаўляецца тав. Сяргееву — кандыдату ў депутаты Брэсцкага абласнога Совета депутатаў працоўных ад 57 Ружанскай выбарчай акругі. Тав. Сяргееў падзякаваў сабраўшымся за аказанае давер'е і расказаў аб сваім жыццёвым шляху.

Выступіўшыя тав. Эйцішэйн, Несцяровіч, Левітан і іншыя ў сваіх выступленнях прыводзілі прыклады з цяжкага мінулага, расказвалі аб шчасці жыць у совецкай краіне і заклікалі ўсіх выбаршчыкаў аддаць свае галасы за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных.

— Мы доўга чакалі гэтага часу,—гаворыць тав. Сонка. Для нас вялікае шчасце свабодна і радасна галасаваць за лепшых людзей народа. Я ўпэўнен, што 15 снежня ўсе выбаршчыкі аддадуць свае галасы за лепшых сыноў і дачок народа.

У гэты-ж дзень вечарам у памяшканні кіно 450 выбаршчыкаў таксама сустракаліся з тав. Сяргеевым.

Адзін за другім мяняліся на трыбуне выбаршчыкі. Выступалі Пятрочка, Урбановіч, Лапідус і іншыя. Усе яны заяўляюць, што дзень выбараў працоўныя Ружан сустракаюць, як сапраўднае свята і прагаласуюць за сваё шчасце і радасць.

Тав. Каўбавец у сваім выступленні застанавіўся на бяспраўі жанчын у былой панскай Польшчы і расказала аб жыцці свабоднай совецкай жанчыны.

Пад здравіцы ў гонар вялікай партыі Леніна-Сталіна даверана аб'яўляе сход закрытым.

В. В. Крычэўскі.

Кандыдат у дэпутаты Беластоцкага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных, брыгадзір 5-га тэкстыльнага камбіната комсамолец Без М. І. за работай.

Фота А. Сапіра.

ЖЫЦЦЁ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Мехвадзіцелі тт. Швецоў (злева) і Ікранікаў (Н-ская часць ЗахАВА) перад выступленнем на марш заключаюць дагавор на соцспаборніцтва.

Фотахроніка Белта.

На здымку: радысты — чырвонаармеец А. Ф. Дзюкаў (злева) і малодшы камандзір узвода Г. І. Бадуноў за работай на назіральным пункце (Н-ская часць ЗахАВА).

Патрабавальны камандзір, добры выхавацель

Вялікі і складаны шлях прайшоў у Чырвонай Армії тав. Маркін — ад радавога байца да старшыны падраздзялення. У гэтым годзе заканчваецца тэрмін яго сапраўднай ваеннай службы. Ён так моцна зрадніўся з ваеннымі парадкамі, з чырвонаармейскім асяроддзем, што рашыў канчаткова і надалей працягваць сваю службу ў Чырвонай Армії. У рапорце камандзіру падраздзялення ён пісаў:

„Канчаецца тэрмін маёй сапраўднай службы. Прашу камандзіра залічыць мяне на звыштэрміновую службу. Я рашыў прысвяціць сваё жыццё Чырвонай Армії. Запэўніваю камандзіра, што і надалей яшчэ лепш буду работаць над удасканаленнем сваіх ваенных ведаў. Свае веды буду перадаваць чырвонаармейскай масе. Сваіх падпарадкаваных буду выхоўваць у духу адданасці вялікай партыі Леніна-Сталіна“.

Камандзіра задаволіла яго просьбу. Тав. Маркін залічан на звыштэрміновую службу, яму даверана адказнейшая і ганаровая работа па выхаванню і абучэнню маладога папаўнення.

Аб сваёй рабоце старшына Маркін гаворыць так:

—Першае, што патрэбна ў рабоце гэта любоў да справы, адчуваць адказнасць за даручаную работу, быць патрабавальным да сябе і падпарадкаваных. Асабліва адказная работа старшыны з уноў прыбыўшымі байцамі: іх трэба дэталёва пазнаёміць з усімі палажэннямі армейскага жыцця, з правіламі і абавязкамі ваеннаслужачага РСЧА, дэталёва і падрабязна растлумачыць патрабаванні статута, выхаваць з кожнага байца чалавека здольнага на любыя подвігі ў імя радзімы.

Патрабавальнасць і клопаты праяўляе аб сваіх байцах тав. Маркін, выхоўвае іх у духу дысцыплінаванасці. Ён за кароткі перыяд дабіўся добрых вынікаў у сваім падраздзяленні. Байцы паказваюць прыклад дысцыплінаванасці, заўсёды акуратна апранутыя і падцягнуты.

Тав. Маркін па праву лічыцца лепшым старшыной у часці. Ён не толькі добры гаспадарнік і клапатлівы выхавальца, але і выдатны ваенны спецыяліст, перадавік баявой і палітычнай падрыхтоўкі. Тав. Маркін дасканала валодае баявой тэхнікай, свае тэарэтычныя веды і практычны вопыт работы штодзённа перадае байцам і малодшым камандзірам, вучыць іх, як трэба выконваць свяшчэнны доўг грамадзяніна і воіна перад радзімай.

Зах. АВА П. Тімачоў.

Баявыя падругі вывучаюць ваенную справу

Добра зразумелі сваё месца ў падрыхтоўцы да абароны радзімы жонкі камандна-начальствуючага састава нашай часці. Кожная з іх упарта працуе над авалоданнем ваеннай спецыяльнасцю, дапамагае свайму мужу ўмацоўваць абаронную магутнасць Чырвонай Арміі. Побач з вывучэннем матэрыяльнай часткі вінтоўкі, баявыя падругі вывучаюць ваенна-хімічную справу. Яны добра вывучылі процівагаз. Зараз знаёмяцца з уласцівасцямі і дзеяннямі атручваючых вашчэстваў, прывучаюць сябе быць доўгі час у процівагазах.

Днямі яны зрабілі ваенізаваны паход у процівагазах. 5-кіламетравы марш баявыя падругі прайшлі за 50 мінут. Усе ўдзельнікі паходу прыбылі да фініша бадзёрымі і здаровымі, без адной адстаючай. Асабліва добрую выносліваасць паказалі тт. Макарава, Загуляева, Жукава.

П. Т.

Зах. АВА.

Марксізм - ленінізм і рэлігія

Тысячагодзі [illegible] ўсі[illegible] „бога“ на небе, [illegible] існа[illegible] „божага царства“, [illegible] лю[illegible]й. На гэтай [illegible] [illegible]ліся зараз грунтуюцца ўсе рэлігіі.

Аднак навука даказала, што [illegible]кага „бога“ не існуе. Свет матэрыяльны. Прычым матэрыя існуе вечна і развіваецца ў сілу [illegible]утраных, ёй уласцівых законаў. [illegible]годзе свайго развіцця матэрыя [illegible]раджае розныя формы свайго [illegible]авання. А там, жывая клетка, [illegible]арганізм, чалавек — рознастайныя [illegible] матэрыі.

Матэрыялістычнае разуменне свету Маркс і Энгельс паклалі ў [illegible]ову тлумачэння грамадскага жыцця, стварыўшы навуку аб гісторыі грамадства — гістарычны матэрыялізм.

Гістарычны матэрыялізм вучыць, што матэрыяльная асноў[illegible] грамадства з'яўляецца вытворчасць, гэта значыць дзейнасць людзей, накіраваная на вытворчасць сродкаў існавання. Гэта матэрыяльная, вытворчая дзейнасць вызначае ўсе астатнія сферы грамадскага жыцця „Спосаб вытворчасці матэрыяльнага жыцця,—пісаў Маркс, — абумоўлівае соцыяльны, палітычны і духоўны працэсы жыцця наогул. Не сазнанне вызначае іх быццё, а, наадварот, іх грамадскае быццё вызначае іх сазнанне“. (К. Маркс і Ф. Энгельс. Творы, том XII, ч. I, стар. 6).

Паводле вучэння Маркса і Энгельса, рэлігія таксама, як дзяржава, права, літаратура, нагэта звыш натуральнага, патустароннага, „божэственнага“ у рэлігіі няма.

Марксізм-ленінізм дае і строга навуковае і адзіна правільнае тлумачэнне карэннай рэлігіі.

У першабытным грамадстве людзі былі бяссільны падпарадкаваць сабе сілы прыроды. Знаходзячыся на нізкім узроўні эканамічнага развіцця, не валодаючы развітай тэхнікай, дзікары былі падаўлены магутнымі стыхіямі прыроды, якія ўнушалі ім страх і трапятанне. Пазней, у класавым грамадстве, людзі аказаліся бяссільнымі і перад прыгнятаючымі іх грамадскімі адносінамі. Марксізм-ленінізм звязвае ўзнікненне і існаванне рэлігіі іменна з гэтымі з'явамі. „Бяссілле эксплуатуемых класаў, — пісаў Ленін, — у барацьбе з эксплуататарамі таксама неміноча парадж[illegible] веру ў лепшае загробнае жыццё, як бяссілле дзікара ў барацьбе з прыродай парадж[illegible] веру ў багоў, чарцей, у цулы і т. п.“ (Ленін, творы, т. VIII, стар 419). Тая-ж думка падкрэсліваецца Леніным у другім месцы, дзе ён піша: „Соцыяльная прыгнечанасць працоўных мас, здаючаяся поўная бездапаможнасць іх перад слепымі сіламі капіталізма, які прычыняе штодзённа і штогадзінна ў тысячу раз больш самых жахлівых пакут, самых дзікіх мучэнняў радавым рабочым людзям, чым усякія з раду вон выходзячыя падзеі накшталт войн, землятрасенняў і т. д., — вось у чым самы глыбокі сучасны корань рэлігіі“ (Ленін. творы. т. XIV. стар 71).

[illegible] рэлігіі, марксізм-ленінізм адказвае і на пытанне аб лёсе рэлігіі. Марксісцка-ленінская навука сцвярджае, што рэлігія не вечная. Яе існаванне шчыльна звязана з існаваннем класавага грамадства. У грамадстве, дзе не будзе класаў, дзе будзе знішчана эксплуатацыя чалавека чалавекам, дзе знікне гнёт прыроды над чалавекам,— у гэтым грамадстве не будзе і рэлігіі. Аб гэтым запісана ў праграме комуністычнай партыі: „... толькі ажыццяўленне планамернасці і свядомасці ва ўсёй грамадска-гаспадарчай дзейнасці мас пацягне за сабой поўнае адміранне рэлігійных забабон“.

Дамарксаўскія атэісты меркавалі, што адзіна надзейным сродкам у барацьбе супроць рэлігійных забабонаў з'яўляецца адукаванне мас, распаўсюджанне навуковых ведаў аб свеце, аб жыцці і т. п.

Марксізм-ленінізм, прызнаючы велізарнае значэнне асветнай работы ў перамаганні рэлігійных перажыткаў, падкрэслівае, што аднаго распаўсюджвання навукі для гэтай мэты зусім недастаткова. У класавым грамадстве карэнні рэлігіі галоўным чынам соцыяльныя. Таму аснова асноў у барацьбе супроць рэлігіі заключаецца ў змяненні класавага грамадскага ладу, у знішчэнні эксплуатацыі чалавека чалавекам і ў пабудове бяскласавага соцыялістычнага грамадства. „Ніякая асветная кніжка, — пісаў Ленін, — не вытрэвіць рэлігіі з забітых капіталістычнай катаргай мас, залежачых ад слепых разбуральных сіл капіталізма, пакуль гэтыя масы самі не навучацца [illegible] панавання капітала ва ўсіх формах“ (Ленін, творы, т. XIV, стар. 71).

Правільнасць гэтага палажэння марксізма-ленінізма пацвярджана практыкай. Толькі ў СССР, дзе ліквідаваны эксплуататарскія класы, знішчана эксплуатацыя чалавека чалавекам і створан соцыялістычны лад, асноўныя карэнні рэлігіі па-сапраўднаму знішчаны і атэізм сярод найшырэйшых мас працоўных горада і вёскі атрымаў небачаны размах.

Асноўнае, галоўнае ў марксісцка-ленінскім вучэнні аб рэлігіі— гэта выкрыццё яе класавай, эксплуататарскай сутнасці. У грамадстве, якое застаіць з непрымірыма варожых класаў, у грамадстве, дзе кіпіць самая жорсткая барацьба эксплуатуемых супроць эксплуататараў, — у гэтым грамадстве пануючыя класы заўсёды маюць патрэбу ў сродках захавання і ўмацавання свайго панавання.

У артыкуле „Крах II Інтэрнацыянала“ Ленін піша: „Усе і ўсякія прыгнятаючыя класы маюць патрэбу для аховы свайго панавання ў двух соцыяльных функцыях: у функцыі ката і ў функцыі папа. Кат павінен падаўляць пратест і абурэнне прыгнечаных, поп павінен маляваць ім перспектывы, (гэта асабліва ручна рабіць без ручацельства за „ажыццявімасць“ такіх перспектыў...) змякчэнне бядот [illegible]фар пры захаванні [illegible] панавання, а ті[illegible] прымірыць іх з гэтым па[illegible], [illegible] іх ад рэвалю[illegible], падрываць [illegible]

Асабліва шкодным Ленін лічыў такія формы рэлігіі, у якіх ідэя „божанькі“ прыфарбавана, „апранута ў нарадныя ідэйныя касцюмы“. Богабудаўнікі і богашукальнікі, напрыклад, у годы царскай рэакцыі шукалі рэлігію, якая-б асвячала соцыялізм. Сектанты, адхіляючы грубае папоўскае праваслаўе, стараюць розныя „тонкія“ формы рэлігіі, спрабуюць прымірыць рэлігію з навукай. Гэтыя формы рэлігіі асабліва небяспечны, указваў Ленін, бо іх выкрыць значна больш цяжка, чым грубае, папоўскае мракабесае.

Зыходзячы з палажэння аб тым, што рэлігія ёсць опіум для народа, комуністычная партыя заўсёды вяла барацьбу супроць рэлігіі.

Як-бы ў адказ тым таварышам, якія зараз лічаць антырэлігійную прапаганду толькі справай Саюза бязбожнікаў, Ленін піша: „Наша прапаганда неабходна ўключае і прапаганду атэізма...“. Уся прапагандысцкая работа, праводзімая партыйнымі і іншымі арганізацыямі, уся работа па комуністычнаму выхаванню мас павінна, такім чынам, арганічна ўключаць у сябе элементы антырэлігійнай прапаганды.

Як-жа павінна весціся антырэлігійная прапаганда?

Змест антырэлігійнай прапаганды вычарпальна падкрэслен за ўказаннях Леніна і Сталіна, у рашэннях комуністычнай партыі па гэтаму пытанню: „... растлумачэнне сапраўдных гістарычных і эканамічных карэнняў рэлігіянага ту[illegible]ма“ — вось што патрабаваў раней за ўсё Ленін ад антырэлігійн[illegible] [illegible]чады.

[illegible] толкова, проста і [illegible] што рэлігія не ёсць нешта звышнатуральнае, што яна земная з'ява, вырастаючая немінуча на глебе класавага, эксплуататарскага грамадства. Антырэлігійная прапаганда павінна ўскрываць класавую ролю рэлігіі, рэакцыйны характар рэлігійных арганізацый.

Другая старана, якую нельга забываць у антырэлігійнай прапагандзе,—гэта выкрыццё антынавуковага характара рэлігіі. Трэба паказаць, што рэлігія змагаецца з навукай, якая дапамагае рабочым і калгаснікам будаваць соцыялізм, што рэлігія імкнецца замацаваць у нашым быце шкодныя, суперэчачыя навуцы, правілы. Гэта асабліва бачна на прыкладах сельскай гаспадаркі: узяць хоць-бы веру ў сілу малітваў, малебнаў, прымет і т. д.

На фактах нашай сапраўднасці трэба паказваць, як соцыялістычная навука дапамагае працоўным будаваць жыццё, перарабляць і падпарадкаваць прыроду, а рэлігія асуджае чалавецтва на невуцтва, варварства і эксплуатацыю. Дасягненні сельскай гаспадаркі ў СССР, рост заможнасці калгаснікаў, калгасы мільянеры, блікучыя дасягненні Мічурына, Лысенка, Ціцына — усё гэта асабліва пераканаўчыя аргументы ў справе барацьбы з рэлігіяй.

Антырэлігійную прапаганду трэба весці так, каб яна дапамагала барацьбе за комунізм, была звязана з велізарнай творчай работай, якую вядуць у нашай краіне працоўныя пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і вялікага Сталіна.

Ф. Блашчук

Сур'ёзна працаваць з агітатарамі

Агіткалектыў Блудзенскага сельсовета, Баразаўскага раёна, складаецца з 38 агітатараў. Сярод іх—настаўнікі, комсамольцы і галоўным чынам мясцовыя сяляне-актывісты, праявіўшыя сябе на грамадскай рабоце па ўстанаўленню совецкай улады на вызваленай зямлі, па будаўніцтву новага соцыялістычнага жыцця, па ўдзелу ў выбарах дэпутатаў у Вярхоўныя Саветы СССР і БССР.

Пераважная большасць агітатараў мае вялікую зацікаўленасць агітацыйнай работай. На праводзімых сходах сялян, на нарадах агітатары актыўна выступаюць, дапамагаюць сельсовету ў паспяховым правядзенні гаспадарча-палітычных кампаній. Вялікую растлумачальную работу яны праводзяць праз індывідуальныя гутаркі з працоўнымі.

Жаданне ў агітатараў працаваць як мага лепш вялікае, аднак яны не атрымоўваюць належнай дапамогі і кіраўніцтва ад кіраўніка агіткалектыва тав. Барушка.

Да дня выбараў засталося мала часу, а з імі яшчэ не праведзена ніводнага семінара па вывучэнню выбарчага закона і Сталінскай Канстытуцыі. У вёсках сельсовета не працуе ні адзін гурток. Агітатары без папярэдняй падрыхтоўкі вяршаюцца пайсці да выбаршчыкаў.

Нарэшце, 15 лістапада кіраўнік агіткалектыва тав. Барушка паведаміў сельсовет, што вечарам ён прыедзе і правядзе семінар агітатараў. У вызначаны час сабралася 20 чалавек, своечасова прыехаў і тав. Барушка.

Агітатары задаволеныя чакаюць пачатку семінара. Аднак яны хутка расчароўваюцца. Кіраўнік агіткалектыва нечакана абвяшчае, што „семінара не будзе, а будзе нарада. Усіх агітатараў замацуем за выбарчымі акругамі".

Хутка быў зачытан спіс, дзе хто павінен працаваць.

— Якія будуць пытанні — запытвае тав. Барушка.

Пытанняў паступіла многа, усе яны зводзіліся да аднаго: каб правесці семінар, прычым рэгулярна яго праводзіць перад кожнай чарговай гутаркай у гуртках.

Яшчэ больш здзівіла прысутных, калі т. Барушка адказаў на гэтыя пытанні, што семінара праводзіць непатрэбна „Выбарчы закон і Канстытуцыя вельмі зразумелыя, дастаткова толькі добра выбаршчыкам прачытаць". Вядомая справа, агітатары з думкай тав. Барушка не згадзіліся і настойліва патрабавелі папярэдняй іх падрыхтоўкі праз семінар.

Становіцца загадкай, чаму тав. Барушка, склікаўшы агітатараў на семінар, не праводзіў яго, а замяніў нарадай, ад якой агітатары не атрымалі ніякай карысці (замацаванне агітатараў па акругах магчыма было зрабіць з такімжа поспехам і пасля семінара).

Прычына зрыва семінара заключаецца ў недобрасумленных адносінах кіраўніка агіткалектыва да выканання партыйных даручэнняў. Ён прыехаў праводзіць семінар зусім непадрыхтаваным.

Выпадак з тав. Барушка з'яўляецца сур'ёзным сігналам. Аддзел прапаганды і агітацыі райкома КП(б)Б павінен устанавіць строгі кантроль над работай кіраўнікоў агіткалектываў, арганізаваць ім сталую дапамогу праз сістэматычнае правядзенне кансультацый і семінараў. Трэба памятаць, што толькі дапамога і кантроль па сутнасці забяспечаць наладжванне глыбокай і змястоўнай агітацыі сярод працоўных, асабліва зараз, у дні падрыхтоўкі да дня выбараў.

А. Рожанец.

Юныя натуралісты Гарадоцкага дзіцячага дома № 1 Віцебскай абласці, удзельніцы Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 1940г. (злева направа) Надзя Гаўрыленка, Дуся Чарталысава і Рахіль Ліўшыц за адборам на насенне гарбузоў ураджаю гэтага года.
Фота І. Лосева. *Фотахроніка Белта.*

Жывёле падрыхтавана цёплая і сытая зімоўка

Вялікую ўвагу надаюць калгаснікі маладых калгасаў Жабінкаўскага раёна развіццю гаспадарчай жывёлагадоўлі. Усе калгасныя фермы ўкамплектаваны жывёлай. Загатоўлены кармы на стойлавы перыяд.

У час уборкі сенажаці калгаснікі па-гаспадароску скасілі лугі, высушылі і застагавалі сена. Калі праводзіўся абмалот, яны склалі ўсю мякіну ў пуні і салому ў стагі.

Зоатэхнікі раённага зямельнага аддзела склалі ў калгасах кармавыя баланосы.

Каб захаваць жывёлу ў зімовы перыяд у добрай укормленасці, ёй патрэбна падрыхтаваць цёплыя памяшканні. Гэтага таксама не ўпусцілі калгасы. Яны адрамантавалі і ўцяплілі ўсе старыя канюшні, кароўнікі, свінарнікі і аўчарнікі. Дзе не хапала памяшканняў, пабудавалі новыя.

У калгасе „17 верасня" (старшыня тав. Малошак) поўнасцю адрамантавалі і ўцяплілі 4 канюшні на 102 кані, кароўнік на 64 галавы жывёлы, аўчарнік на 60 авечак. Пабудаван новы свінарнік на 85 свіней. Падрыхтавана ўжо памяшканне для будучага прыплоду на 40 цялят. Для жывёлы, згодна кармавога баланса, захавана 3.620 цэнтнераў грубых кармоў, 1.599 цэнтнераў бульбы, 509 цэнтнераў канцэнтратаў. Вызначана 730 цэнтнераў саломы на падсціл.

Вялікая работа па забе[illegible]ню жывёле цёплай і сытай зімоўкі праведзена ў калгасе імені Варашылава. Тут адрамантавана і ацеплена канюшня на 20 коней і пабудавана новая на 30 коней, пабудаван новы кароўнік на 35 кароў, уцеплен свінарнік і аўчарнік. У гэтым калгасе ёсць 60 трусоў і 40 птушак, для якіх таксама поўнасцю падрыхтаваны памяшканні і кармы на зімовы перыяд.

Падрыхтаванымі сустракаюць зіму і калгасы імені Чырвонай Арміі, „Шлях соцыялізма", „Першага Мая", імені Леніна і другія.

Для забеспячэння жывёлы вадой калгасы імені Чырвонай Арміі, „Шлях соцыялізма" і „17 верасня" пабудавалі кожны па адной студні.

У калгасах Жабінкаўскага раёна кармамі забяспечана не толькі грамадская жывёла, але і жывёла, якая знаходзіцца ў асабістым карыстанні калгаснікаў. У калгасе імені Сталіна на кожны працадзень калгаснікі пры канчатковым размеркаванні выходзіць па 9,3 кілограма сена і саломы і па 26 кілограмаў бульбы. Многія калгаснікі не толькі пракормяць сваю жывёлу, але змогуць значную частку кармоў прадаць дзяржаве. Па 7 кілограмаў грубых кармоў і 28 кілограмы бульбы атрымліваюць на кожны працадзень члены калгаса імені Чырвонай арміі.

Работнікі жывёлагадоўчых ферм многіх калгасаў раёна па-большавіцку змагаюцца за ўзняцце прадукцыйнасці жывёлы. Яны ледуюць прыкладу перадавых жывёлаводаў нашай краіны і ўжо дабіліся надзвычайных вынікаў. [illegible] ярка калгаса імені Сталіна [illegible] Прыдатак Анна [illegible] доіць [illegible] Усе каровы добра[illegible] Яна дабілася ўд[illegible] фуражнай капус[illegible] за [illegible]

[illegible] ліста[illegible]да ў спартыўным [illegible] „Будаўнік-Цэнтра" пачаўся [illegible] розыгрыш на першынства [illegible] па баскетболу, арганізава[illegible] гарадскім камітетам [illegible] фізкультуры і спорта. [illegible]шы ўдзельнічае 11 мас[illegible] баскетбольных каманд [illegible], у тым ліку каманды спар[illegible]ных таварыстваў Дома Чырвонай Арміі, „Спартак", „Будаўнік-Цэнтра" „Дынамо" і інш.

У выхадны дзень 17 лістапада адбылася фінальная ігра паміж жаночымі першымі камандамі Дома Чырвонай Арміі і спартыўнага таварыства „Спартак". У гэтай цікавай сустрэчы пераможцамі выйшлі спартакаўцы, закончыўшы ігру лікам 27:4. У час ігры асабліва вызначыліся баскетбалісткі — фізкультурніцы таварыства „Спартак" тт. Пагажэльская, Кацаф і Саламановіч, якія паказалі высокае спартыўнае майстэрства і клас ігры.

Чарговая сустрэча на першынстве горада паміж мужчынскімі камандамі Дома Чырвонай Арміі (другая каманда) і „Спартак" (другая каманда) закончылася [illegible] лікам 50:25 у карысць „Спартака".

Пасля двух атрыманых [illegible] паражэнняў з розыгрыша [illegible] каманды спартыўных таварыстваў „Усход", „Будаўнік - Ц[illegible]", „Дынамо", Дома Чырвонай [illegible] (другая і трэцяя каманды) [illegible] „Спартак" (другая).

Претэндэнтамі на перш[illegible] [illegible]ца засталіся першыя каманды спартыўнага таварыства „Спартак" і Дома Чырвонай Арміі. Фінальная сустрэча гэтых каманд адбудзецца 22 лістапада ў 8 гадзін вечара.

А. Кадубе.

Нарада па пытанню тэатральнай крытыкі

18 лістапада рэдакцыя газеты „Зара" і абласны аддзел мастацтваў правялі нараду работнікаў мастацтваў па пытанню лепшага асвятлення і паказу на старонках газеты самадзейных мастацкіх калектываў і дзяржаўных тэатраў.

Упаўнаважаная Галоўрэпертакома тав. Чэрмухіна ўсебакова асвятліла задачы тэатральнай крытыкі.

—Тэатр—мастацтва найбольш даступнае, папулярнае, найбольш дахопчывае для шырокіх мас працоўных. Праз тэатр мы выхоўваем працоўныя масы, пашыраем кругазор. Вось чаму адказная і ганаровая задача тэатральных крытыкаў.

—Тэатральны крытык выхоўвае гледача, выхоўвае актора, работае з драматургам. Аднак нашы таварышы, якія пішуць рэцэнзіі ў абласной газеце дрэнна спраўляюцца з гэтымі задачамі. Мы даем недастатковы аналіз работы акторaў, зусім не паказваем творчую работу рэжысёраў і мастакоў. А работнікі сцэны чакаюць ад нас заўваг, каб у далейшым іх выправіць.

Выступіўшы тав. Фрыдман сказаў:—Мяне тэатр вабіць, але рэцэнзіі я пішу нядаўна. Мабіць, была напісана заметка на „Сям'ю Авадыс" у пастаноўцы Віцебскага дзяржаўнага яўрэйскага тэатра. Сваёй мэтай я ставіў расказаць чытачам аб змесце п'есы, якая вельмі ўдала напісана.

Тав. Архіпаў правільна ўзпаў пытанне аб выхаванні ў першую чаргу тэатральных крытыкаў, якія патрабуюць вялікай дапамогі ў павышэнні іх адукацыі і кругазору. Патрэбна, каб на старонках газеты пісалі не толькі прафесіяналы, але і рабочыя, служачыя і інтэлігенты аб рабоце нашых тэатраў.

Загадчык абласным аддзелам мастацтваў тав. Абрасімаў заклікаў удзельнікаў нарады шырэй асвятляць жыццё работнікаў мастацтваў на старонках абласной газеты.

— У нас мала кваліфікаваных тэатральных крытыкаў,—гаворыць тав. Абрасімаў, але гэта не азначае, што мы не павінны паказваць удзячны творчы шлях нашых работнікаў сцэны. У Брэсце было нямала таленавітых калектываў і выканаўцаў. „Зара" недастаткова асвятліла іх работу. Гэта вялікі недахоп.

На-днях у Брэст на гастролі прыедзе Пінскі абласны драматычны тэатр. У першых лічбах снежня будзе Беластоцкі польскі дзяржаўны тэатр, да канца снежня на пастаянную работу ў Брэст прыедуць выпускнікі Маскоўскай студыі народнага артыста Тарахапава. Наш абавязак шырока паказваць работу гэтых тэатраў, дапамагчы ім у іх рабоце.

Патрэбна, каб водгукі аб спектаклях, аб асобных артыстах, аб музыкальным і мастацкім афармленні пісаў не адзін чалавек, а некалькі. І гэльмі прыемна было-б, каб музыкант пісаў аб музычным афармленні тэатра, мастак — аб мастацкім, — тады каштоўнасць гэтых водгукаў будзе высокая і гэта дапаможа тэатральным калектывам у выпраўленні іх недахопаў.

Вечар мастацкай самадзейнасці ў вёсцы Сенькавічы

16 лістапада ў вёсцы Сенькавічы, Косаўскага раёна, адбыўся вечар мастацкай самадзейнасці.

Струнны гурток пад кіраўніцтвам тав. Шапавалава выканаў рад цікавых нумараў. Харавы гурток пад кіраўніцтвам тав. Печугіна выканаў: „Марш танкістаў" і рад другіх совецкіх песень. Удзельнікі мастацкай самадзейнасці выканалі таксама многа народных танцаў і прадэманстравалі некалькі вершаў.

Сяляне засталіся вельмі задаволеныя праведзеным вечарам.

І. Л. Лаўрынчук.

Фізкультура і спорт.

Розыгрыш пяршынства па баскетболу

Першыя калгасы ў Эстонскай ССР

Сяляне вёскі Камароўка Нарвскай воласці арганізавалі калгас „Чырвоная Камароўка". Гэта адзін з першых калгасаў у Совецкай Эстоніі. У сельскагаспадарчую арцель уступіла 69 членаў, яна распалагае 380 гектарамі зямлі.

Праўленне калгаса абмяркоўвае план работы.

Фота Н. Янава. *Фота ТАСС.*

Проціпаветраная абарона Лондана

Пасля захвату германскімі войскамі Даніі і Нарвегіі базы германскай авіяцыі надзвычай наблізіліся да Лондана. Заняцце германскімі войскамі Бельгіі і паўночна - заходняга ўзбярэжжа Францыі пагоршыла гэта становішча. У выніку проціпаветраная абарона Лондана павінна была змяніцца.

Цэнтральнае месца ў сістэме проціпаветранай абароны (ППА) Лондана займаюць актыўныя сродкі, у першую чаргу знішчальная авіяцыя і шматлікія батарэі зенітнай артылерыі. Апрача таго Лондан прыкрыт з паветра сотнямі аэрастатаў заграджэння.

На аэрадромах вакол Лондана, на шляхах галоўных напрамкаў магчымых налётаў германскай авіяцыі размешчаны шматлікія знішчальныя эскадрыллі.

Адлегласць ад германскіх авіябаз да Лондана зараз вельмі невялікая; англійскія знішчальнікі маюць намнога часу, каб падняцца ў паветра і сустрэць праціўніка, калі ён пералятае „перадавую лінію ППА".

У сувязі з гэтым група англійскіх знішчальнікаў нясе ахову ў паветры, на галоўных напрамках да Лондана і над морам. Скарыстоўваючы перавагу ў скорасці, гэтыя самалёты павінны атакаваць з тылу германскія самалёты, якія накіроўваюцца да Лондана, або [illegible]ваць удзел у праследванні [illegible]ных са[illegible], якія вяртаю[illegible] [illegible]ла [illegible] Лондан.

Прарваўшыся праз „перадавую лінію ППА", германскія самалёты сустракаюць на сваім шляху таксама эскадрыллі англійскіх аднамясцовых знішчальнікаў-перахватчыкаў, якім прыходзіцца весці бой ужо на самых подступах да Лондана або непасрэдна над яго тэрыторыяй.

Разам са знішчальнай авіяцыяй атакі германскіх самалётаў адбівае зенітная артылерыя. Шматлікія батарэі зенітнай артылерыі размешчаны вакол Лондана і ў самым горадзе на плошчах, у парках, скверах і іншых зручных для дзеянняў зенітнай артылерыі месцах.

Па звестках германскага друку, англічане прымяняюць зенітныя гарматы буйных і дробных калібраў, а таксама 40-міліметравыя аўтаматычныя зенітныя гарматы „Бофорс" і зенітныя кулямёты. Сярод цяжкіх зенітных гармат, абараняючых Лондан, ёсць 102 і 120-міліметравыя гарматы „Вікерс", якія могуць страляць на вышыню да 12.500 —13.200 метраў. Гэтыя гарматы прымушаюць германскія самалёты трымацца на вялікай вышыні і губляць з прычыны гэтага дакладнасць прыцэльвання.

Калі ўст[illegible] у дзеянне англійскія знішча[illegible]кі, зенітная артылерыя па папярэдняму сігналу камандзіра знішчаль[illegible]каў (за 10—20 секунд да пачатку [illegible]кі знішчальнікаў) [illegible] агонь. Зенітчыкі [illegible] таксама па сігналу камандзіра знішчальнікаў.

Узаемадзеянне зенітнай артылерыі са знішчальнай авіяцыяй — справа вельмі складаная, і англійскае камандванне надае яму вялікае значэнне. У асаблівасці цяжка ажыццяўляць гэтае ўзаемадзеянне ў начны час. Непрыяцельскі самалёт толькі на вельмі кароткі тэрмін пападае ў прамені пражэктара, і трэба адрозніць самалёты праціўніка ад сваіх. У сувязі з гэтым ноччу англійская зенітная артылерыя і знішчальная авіяцыя ў адным і тым-жа раёне сумесна не дзейнічаюць.

Вялікую ўвагу англічане ўдзяляюць службе паветранага нагляду, апавяшчэння і сувязі. Сетка пастоў размешчана не толькі на ўзбярэжжы, але і на моры, дзе нагляд вядзецца на спецыяльных суднах. Над морам патруліруюць спецыяльныя самалёты.

Дзякуючы добрай арганізацыі англійскай службы нагляду і апавяшчэння, германскім самалётам у большасці выпадкаў не ўдаецца рабіць раптоўныя налёты на Лондан.

Вялікае значэнне ў проціпаветранай абароне Лондана маюць аэрастаты заграджэння. Перавагі аэрастатаў заграджэння відавочны, яны ва ўсякі час дня і ночы „гатовы да бою", і калі яны ўжо знаходзяцца ў паветры, то ніякага дадатковага часу для падрыхтоўкі іх у момант налёту германскіх самалётаў не патрабуецца. Частыя туманы і ніякая воблачнасць над тэрыторыяй Лондана садзейнічаюць маскіроўцы аэрастатаў заграджэння і даюць магчымасць прымяняць іх не толькі ноччу, але і днём.

Па даных англійскага друку, Лондан у канцы 1939 года меў 10 атрадаў аэрастатаў заграджэння (кожны атрад па 50 аэрастатаў заграджэння). Англічане прымяняюць аэрастаты заграджэння, якія маюць балон аб'ёмам у 625 кубічных метраў. Напаўненне аэрастата газам займае 20 мінут, пад'ём аэрастата на баявую вышыню (2—3 тысячы метраў) прадаўжаецца ў сярэднім 10—15 мінут.

Такім чынам атрад у 50 аэрастатаў заграджэння пасля прыбыцця ў новы пункт можа праз 30—45 мінут нечакана для праціўніка наладзіць заграджэнне на новым напрамку.

Найбольшы эфект аэрастаты заграджэння даюць ноччу, а таксама ў туманныя і воблачныя дні, калі атакуючыя самалёты не бачаць аэрастата, не могуць збіць яго, затое самі рызыкуюць наткнуцца на лінію заграджэння.

Ноччу англійскія пражэктары час-ад-часу асвятляюць аэрастаты заграджэння для маральнага ўздзеяння на лётчыкаў праціўніка. Як паведамляе замежны друк, германскія лётчыкі, ведаючы аб наяўнасці аэрастатаў заграджэння над даным раёнам, ухіляюцца ад заданага напрамку і вымушаны скідваць бомбы з вялікай вышыні. Апошняе, відома, знижае эфектыўнасць попадання ў цэль.

Найбольш паражальны аэрастаты заграджэння для праціўніка ў ясныя, бязвоблачныя дні. Звычайна германскія знішчальнікі нападаюць на аэрастаты заграджэння ў адзіночку або асобнымі атрадамі досвіткам ці пры змярканні і кулямётным абстрэлам з невялікай адлегласці запальваюць іх.

У „барацьбе за Лондан", якая пачалася ў ліпені 1940 года, германская авіяцыя перыядычна мяняла сваю тактыку.

У ліпені — жніўні германская авіяцыя рабіла налёты невялікімі групамі самалётаў, ахватваючы значную тэрыторыю Англіі. Мэта гэтых налётаў заключалася ў вывучэнні тэатра вайны і разведцы сістэмы англійскай проціпаветранай абароны.

У выніку асобных налётаў на аэрадромы і аб'екты ў самым Лондане немцы к пачатку верасня выявілі слабыя бакі начной ППА Лондана. Выявілася малая магутнасць пражэктараў англійскай ППА, бо дым ад пажараў аслабляў сілу асвятлення; выявіліся таксама недахоп зенітных батарэй і слабасць іх агню, невялікая вышыня пад'ёму аэрастатаў заграджэння.

Вывучыўшы слабыя бакі проціпаветранай абароны Лондана, германская авіяцыя спачатку верасня перайшла да масавых начных атак на сталіцу Англіі.

Самая буйная бамбардыроўка Лондана адбывалася ў ноч на 8 верасня. На працягу амаль 8 гадзін 700 самалётаў (звенямі ў 3—7 самалётаў) паспяхова скідвалі бомбы на Лондан.

Вялікія разбурэнні прынеслі Лондану бамбардыроўкі 10, 11 і 16 кастрычніка. 16 кастрычніка, напрыклад, германская авіяцыя скінула на Лондан, па германскіх звестках, тысячу тон бомб.

У апошні час, у сувязі з узмацненнем проціпаветранай абароны Англіі, у прыватнасці Лондана, і ўзмацніўшайся актыўнасцю англійскай авіяцыі, германскія паветраныя сілы змянілі тактыку нападаў на Лондан. Дзённыя налёты на Лондан праводзяць нямецкія двухматорныя знішчальнікі „Месершмідт-110". Для ночных налётаў скарыстоўваюцца цяжкія бамбардыроўшчыкі, якія бяруць буйныя авіябомбы за лік скарачэння запаса гаручага.

Прымяненне днём знішчальнікаў „Месершмідт-110" сведчыць аб павышэнні якасці англійскай проціпаветранай абароны. Як відаць, англійскія аднамясцовыя знішчальнікі наносяць у дзень адчувальныя страты германскім бамбардыроўшчыкам. Каб знізіць свае страты, германскае камандванне адмовілася ад частых дзённых бамбардыровак Лондана.

У апошні час дзякуючы дапамозе з Амерыкі актыўнасць англійскай авіяцыі ўзмацнілася. Некалькі падняслася таксама якасць проціпаветранай абароны Лондана.

Палкоўнік А. Кананенка.

252

Сустрэча Чыано з Гітлерам

БЕРЛІН, 18 лістапада. (ТАСС). Як паведамляе германскае інфармацыйнае бюро, міністр замежных спраў Італіі Чыано прыбыў сёння ў рэзідэнцыю Гітлера паблізу Берхтэсгадэна. Ён быў запрошан разам з міністрам замежных спраў Іспаніі Серано Суньерам да Гітлера на гарбату, на якой прысутнічалі таксама Рыбентроп і генерал-фельдмаршал Кейтэль. Затым у прысутнасці міністра замежных спраў Рыбентропа адбылася гутарка Гітлера з Чыано.

Паездка Рыбентропа, Чыано, Тэлекі і Чакі ў Вену

БЕРЛІН, 19 лістапада. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе з Зальцбурга, што германскі міністр замежных спраў Рыбентроп і італьянскі міністр замежных спраў Чыано прыбываюць сёння ў Вену.

Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе таксама, што па запрашэнню германскага ўрада 20 лістапада ў Вену прыбываюць венгерскі прэм'ер-міністр Тэлекі і венгерскі міністр замежных спраў Чакі.

Прыезд Рыбентропа і Чыано ў Вену

БЕРЛІН, 19 лістапада. (ТАСС). Як перадае германскае інфармацыйнае бюро, сёння ў 17 гадзін у Вену спецыяльным поездам прыбыў з Зальцбурга германскі міністр замежных спраў Рыбентроп. Ён быў сустрэты на вакзале імперскім намесьнікам у Вене Шырахам. Праз 10 мінут на гэты вакзал прыбыў спецыяльны поезд з італьянскім міністрам замежных спраў Чыано, якога сустрэлі Рыбентроп і Шырах.

Прадстаячы зварот інтэрніраваных французскіх салдатаў з Швейцарыі

КЛЕРМОН-ФЕРАН, 19 лістапада. (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Гавас, з Швейцарыі павінны вярнуцца 30 тысяч інтэрніраваных французскіх салдатаў, якія будуць дэмабілізаваны. Адначасова вызваляюцца з германскага палону бацькі, якія маюць 4-х дзяцей, і старэйшыя браты ў сем'ях, маючых 4-х дзяцей, бацька якіх памёр.

Агенцтва Домей Цусін аб сутычцы паміж войскамі Таі і французскага Інда-Кітая

ТОКІО, 19 лістапада. (ТАСС) Агенцтва Домей Цусін перадае, што выпадкі пералёту граніцы Французскага Інда-Кітая самалётамі Таі паўтараюцца. Войскі Таі [illegible] сутычку з войскамі Франц[illegible] Інда-Кітая ў раёне [illegible] вінцыя Лаос) Сражэнне [illegible] вялікія размеры. Па [illegible] вестках, сутычкі адбы[illegible] таксама ў раёне Вьентьян.

Бітва ў Афрыцы

Лондан, 19 лістапада. (ТАСС) [illegible] ойтэр паведамляе, што ўчора англійскія лёгкія ваенна-марскія судны ўноў бамбардыравалі Данше (Італьянскае Сомалі) Моцныя разбурэнні прычынены нафтавым цыстэрнам, зенітным батарэям і партовым збудаванням.

У ноч на 18 лістапада англійская авіяцыя бамбардыравала Бенгазі, Солум, Бардзія і Тобрук.

Англа-германская вайна

Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 19 лістапада. Вярхоўнае камандаванне германскай арміі паведамляе: „Двума нашымі падводнымі лодкамі патоплены 8 узброеных гандлёвых суднаў праціўніка агульным водазмяшчэннем у 45 тысяч 220 рэгістравых брута-тон.

У ноч на 18 лістапада і ўчора днём германская авіяцыя акрамя Лондана бамбардыравала партовыя і прамысловыя збудаванні Саутгемптона, а таксама ваенныя заводы ў Цэнтральнай Англіі. Італьянскія пікіруючыя бамбардыроўшчыкі зрабілі паспяховы налёт на аэдзін з гарадоў усходняга ўзбярэжжа Англіі.

На моры ля ўсходняга ўзбярэжжа Англіі ўдалося патапіць два гандлёвыя судны па 3 тысячы рэгістравых брута-тон і прычыніць цяжкія пашкоджанні яшчэ тром суднам. Начныя налёты некалькіх англійскіх самалётаў на тэрыторыю Германіі закончыліся безрэзультатна".

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 19 лістапада. (ТАСС). Як паведамляе карэспандэнт газеты „Таймс", акружэнне Корчы з поўдня грэчаскімі войскамі стала магчымым дзякуючы таму, што англійская авіяцыя разбурыла важны ў стратэгічных адносінах мост праз раку Дэвол, па якому праціўнік перакідваў падмацаванні. Ён быў пабудаваны на дарозе Корча Эльбасан — адзіным шляху, па якому маглі быць перакінуты падмацаванні або ажыццяўлёна адступленне.

ЛОНДАН, 19 лістапада. Па паведамленню агенцтва Рэйтэр, камандуючы англійскімі ўзброенымі сіламі ў Грэцыі назначан генерал Долбіяк, які знаходзіўся ўвесь час на ваеннай службе ў Індыі, Егіпце, Трансіарданіі і Палестыне. Да свайго назначэння на свой пост Долбіяк камандваў англійскімі паветранымі сіламі ў Палестыне. (ТАСС).

ЛОНДАН, 19 лістапада. Як перадае міністэрства авіяцыі, у ноч на 19 лістапада германскія самалёты скінулі невялікую колькасць бомб у даліне ракі Мерсей, у раёнах Цэнтральнай і ў радзе месц Паўднёвай Англіі. Матэрыяльныя страты і колькасць афяр нязначныя. Ад узрыву бомб у радзе пунктаў узніклі пажары, якія былі неўзабаве ліквідаваны.

Адначасова паведамляецца, што англійская бамбардыровачная авіяцыя зрабіла налёт на Эльбасан (Албанія). Бомбы былі скінуты на ваенныя склады і ўпалі ў раёне намечаных целей, выклікаўшы тры пажары.

ЛОНДАН, 19 лістапада. Як перадае агенцтва Рэйтэр, у ноч на 19 лістапада невялікія злучэнні англійскіх бамбардыроўшчыкаў зрабілі налёт на нафтасховішчы, размешчаныя ў центры Германіі. (ТАСС).

Амерыканскія паведамленні

НЬЮ-ЙОРК, 19 лістапада. (ТАСС). Па паведамленнях амерыканскага друку, 18 лістапада пасля поўдня ў Лондане была аб'яўлена першая паветраная трывога ў дзень.

У ноч на 18 лістапада германскія самалёты на працягу 13 гадзін у адзіночку бамбілі адзін размешчаны на паўднёвым узбярэжжы Англіі горад, наносячы яму значныя страты. У сувязі з неабходнасцю патушыць агні ў горадзе затруднёна работа па выратаванню людзей з-пад развалін разбураных будынкаў. Колькасць афар яшчэ не ўстаноўлена.

Бамбардыроўка Гамбурга

БЕРЛІН, 18 лістапада. (Т[illegible] Газета „Гамбургер фрэмдэ[illegible] перадае, што ў часе налёту [illegible] лістапада на Гамбург [illegible] самалёты скінулі вялікую [illegible] касць запальвальных і фуг[illegible] бомб. У результаце бамбар[illegible] кі пацярпелі жылы[illegible] [illegible] частках горада ўзніклі [illegible] грамадзянскага [illegible] чаецца некалькі [illegible]

Камунікэ югаслаўскага агенцтва аб абставінах [illegible]

БЕЛГРАД, 19 лістапада. (ТАСС) [illegible] Югаслаўскае тэлеграфнае агенцтва перадае: „Агенцтва ўпаўнаважана апублікаваць наступнае: "Камісія па расследванню, якая вывучае выпадак з бамбардыроўкай Бітоля, зробленай 5 лістапада, устанавіла, што бомбы, упаўшы на Бітоль былі скінуты самалётамі італьянскай авіяцыі. Югаслаўскі ўрад паведаміў 12 лістапада італьянскі ўрад аб результатах расследвання і папрасіў яго зрабіць з сваёй стараны расследванне па гэтаму поваду. Італьянскі ўрад адказаў [illegible] у выніку на[illegible] тальянскія са[illegible] падверглі бам[illegible] ъ. Італьянскі [illegible] гэтаму поваду [illegible] свой [illegible]. У той-жа час італьянскі ўрад даў прынцыпіяльную згоду на пакрыццё страт, узніклых у результаце бамбардыроўкі.

У сувязі з гэтым і дзякуючы існуючым паміж Італіяй і Югаславіяй дружаскім адносінам гэты інцыдэнт павінен разглядацца як вычарпаны".

ВЫСТУПЛЕННЕ МУСАЛІНІ

РЫМ, 19 лістапада. (ТАСС) Агенцтва Стэфані паведамляе, што сёння Мусаліні выступіў з прамовай на нарадзе кіраўнікоў масцовых арганізацый фашысцкай [illegible] На нарадзе прысутнічалі [illegible] ніага фашысцкага [illegible] і члены ўрада.

[illegible] гісторыі ўзнікнення [illegible] 1939 годзе, Мусаліні заявіў, [illegible] о віноўнікам ге[illegible] ліцца Англія, па[illegible] ла ўсе спробы [illegible], зробленыя Германіяй. Гаворачы [illegible] аб ходзе вайны, Мусаліні адзначыў паражэнне англічан у Брытанскім Сомалі і маланкавы захват Сідзі-Барані, які „трэба разглядаць не як завяршэнне, але як пачатак". Марскі флот абаранае камунікацыі Італіі ў Міжземным і Адрыятычным марах настолькі эфектыўна, што непрыяцельскі флот не быў у стане іх праравць. Італьянская авіяцыя панавала і пануе ў паветры. Што датычыць самалётаў, сказаў Мусаліні, дык італьянскія заводы штомесячна выпускаюць іх у 4 разы больш, чым да вайны. У хуткім часе дзякуючы масаваму выпуску новых тыпаў самалётаў Італія, бясспрэчна, дасягне становішча, [illegible] не самалёты будуць [illegible] сучасным самалётам [illegible]н. Трэба адзначыць, [illegible] ліні далей, што абмежаванні, якія выцякаюць з становішча вайны і якія ў сучасны момант яшчэ вынасімы, могуць у будучым стаць яшчэ цяжэйшымі, бо цяперашняя вайна з'яўляецца рашаючай вайной і павінна закончыцца знішчэннем сучаснага Карфагена — Англіі. Надаўна, сказаў далей Мусаліні, англічане паведамілі аб результатах налёту англійскай авіяцыі на Таранто. Іх паведамленне не адпавядае сапраўднасці, паколькі „на самой справе адзначана нападзенне ў тры караблі, але ні адзін з іх не быў патоплен і толькі адзін, як гэта паведамлялася ў зводцы аб ваенных дзеяннях, быў пашкоджан і яго адзіноўленне пагрэбе даволі працяглага часу. Астатнія два, па адзінадушнай думцы тэхнікаў, будуць хутка прыведзены ў іх ранейшы баявы стан". Англічанам, адзначыў Мусаліні, патрэбна было-б паведаміць аб лёсе „Ліверпуля", „Кента" і другіх вельмі буйных англійскіх караблёў, якія былі нядаўна тарпедаваны ў цэнтральнай частцы Міжземнага мора і ў парту Александрыі італьянскімі падводнымі лодкамі і самалётамі-тарпеданосцамі.

Мусаліні заявіў, што саюз Італіі з Германіяй становіцца ўсё больш цесным і распаўсюджваецца на ўсе галіны ваеннай, гаспадарчай, палітычнай і духоўнай дзейнасці. Пераходзячы затым да прычын італа-грэчаскай вайны, Мусаліні сказаў, што з дакументаў, знойдзеных германскім генеральным штабам ва Францыі, відаць, што яшчэ з мая месяца 1940 года Грэцыя прадаставіла французам і англічанам усе свае марскія і паветраныя базы. Неабходна было, заявіў Мусаліні, пакласці канец гэтаму становішчу, што і было зроблена 28 кастрычніка, калі італьянскія войскі перайшлі грэка-албанскую граніцу. Адмаўляючы паведамленне аб разгроме альпійскай дывізіі ў Грэцыі, Мусаліні заявіў, што характар грэчаскага тэатра вайны не дазваляе весці маланкавую вайну. Аднак вайна толькі што пачалася, і Італія мае дастаткова людзей і сродкаў для таго, каб зламаць любое грэчаскае супраціўленне. Англійская дапамога не зможа перашкодзіць выкананню гэтага цвёрдага рашэння Італіі і не адвядзе ад грэкаў катастрофы.

У Італіі, заявіў Мусаліні, знаходзіцца пад ружжом мільён чалавек; у выпадку неабходнасці Італія можа прызваць яшчэ 8 мільёнаў.

У заключэнні Мусаліні паставіў пытанне аб рабоце ва ўмовах вайны фашысцкай партыі.

ІТАЛА-ГРЭЧАСКАЯ ВАЙНА

Амерыканскія паведамленні

НЬЮ-ЙОРК, 19-га лістапада. (ТАСС). Як перадае агенцтва Асошыэйтэд Прэс, паблізу югаслаўскай граніцы адбыўся бой 12 грэчаскіх і англійскіх самалётаў з 15 італьянскімі. 2 італьянскіх самалёты збіты. Учора ў Бітоле былі аб'яўлены тры паветраныя трывогі, аднак горад не падвергся нападзенням авіяцыі.

2 самалёты невядомай нацыянальнасці скінулі бомбы над рэкой Зета паблізу Данілаўграда. Некалькі пазней адзін з гэтых самалётаў разбіўся ў гарах.

Італьянскія паведамленні па поваду бамбардыроўкі Бітоля

РЫМ, 19 лістапада. (ТАСС). Як перадае агенцтва Стэфані, „італьянскія палітычныя кругі адзначаюць, што інцыдэнт, звязаны з бамбардыроўкай Бітоля, быў дружаскі ўрэгуляван паміж Рымам і Белградам і не можа даць поваду да якой небудзь спекуляцыі. Памылка тлумачыцца тым, што Бітоль знаходзіцца ў гарыстым раёне паблізу грэка-албанскай граніцы".

Зводка камандвання грэчаскай арміі

АФІНЫ, 19 лістапада. (ТАСС) Вярхоўнае камандванне грэчаскай арміі перадала наступнае паведамленне: „У Эпіры і ў раёне на ўсход ад Корчы 18 лістапада зноў завязаліся жорсткія баі, у часе якіх былі заняты ўпарта абараняўшыяся пазіцыі праціўніка. Войскі непрыяцеля, пранікшыя раней у раён ніжняга цячэння ракі Каламас, адкінуты на поўнач. Часці, якія прасоўваюцца ўглыб тэрыторыі праціўніка, знішчылі ў Эрэеко і Барова склады з боеприпасамі і гаручым і захацілі некалькі палонных.

У паветраных баях над лініяй фронта збіта 9 італьянскіх самалётаў. Два грэчаскіх самалёты не вярнуліся на свае базы

Наша авіяцыя бамбардыравала аэрадром у Аргірокастроне і паходныя калоны праціўніка.

Італьянскія самалёты безрэзультатна падверглі бамбардыроўцы горад Превезу".

Зводка італьянскага камандвання

РЫМ, 19 лістапада. (ТАСС). Італьянскае камандванне паведамляе: „Учора на фронце Эпіра адбываліся жорсткія сражэнні, якія не змянілі пазіцыі абодвух старон. Непрыяцель заняў адну вёску. Нашы паветраныя злучэнні падверглі жорсткай бамбардыроўцы і кулямётнаму абстрэлу скапленні войск праціўніка. Збіта тры непрыяцельскіх самалёты. Адзін з нашых самалётаў не вярнуўся на сваю базу. Праціўнік спрабаваў запяць вострaў Гайдаро, які ўваходзіць у саставу Дадэканезскага архіпелага, аднак быў адагнан.

У Паўночнай Афрыцы наша авіяцыя бамбардыравала авіяцыйныя збудаванні і казармы праціўніка ля оазіса Сіва. Значна пашкоджаны ўсе аб'екты. Непрыяцельскія самалёты скінулі бомбы на Тобрук і Бардзію. Афяр і пашкоджанняў няма. У Солуме ў разультаце бамбардыроўкі забіта тры і ранена 5 чалавек.

Ва Ўсходняй Афрыцы праціўнік зрабіў налёты на Агордат, Корондзіл, Буна і Герыле, не прычыніўшы ім істотных пашкоджанняў".

Амерыканскія карэспандэнты аб ваенных дзеяннях у Грэцыі

НЬЮ-ЙОРК, 18 лістапада. (ТАСС). Афінскі карэспандэнт агенцтва Юнайтэд Прэс перадае, што грэчаскія войскі выцеснілі з Грэцыі апошнія італьянскія часці." У сучасны момант грэкі прасоўваюцца па албанскай тэрыторыі.

У другім паведамленні карэспандэнт перадае, што грэкі знішчылі італьянскі атрад, які складаў з 130 браневікоў і танкаў, відаючы, спрабаваўшых скрыцца на тэрыторыю Югаславіі. У ваенных кругах указваюць, што часці, адбіўшыя ў італьянцаў Коніцу, некалькі пазней занялі вёску Лесковікі і ў сучасны момант наступаюць на Корчу. Гэтыя часці ўжо дасягнулі прадмесцяў Эрэеко, эвакуіруемых італьянцамі. На фронце Корчы італьянскія войскі ўсё яшчэ ўтрымліваюць вяршыню Іван-гары, але грэчаскія войскі прымусілі адступіць іх ад падножжа гэтай гары. Як перадаюць, італьянскія бамбардыроўшчыкі спрабуюць спыніць ад ступленне італьянскіх часцей, аднак дзеянні іх затрымані ў сувязі з дрэнным надвор'ем. У прыбярэжным сектары італьянцы адступаюць у кірунку да Санці-Кваранта, кідаючы ўзбраенне і грузавікі ля ракі Каламас і ў балотах. Грэчаскія часці наступаюць ад захвачанага імі горада Філіатэе. Гэтым часцям аказвае падтрымку атрад эсмінцаў адмірала Кавадыуса. Эсмінцы абстрэльваюць адступаючыя італьянскія часці. Як указвае карэспандэнт, гэты атрад эсмінцаў абстраляў вострaў Сасено.

Афінскі карэспандэнт агенцтва Асошыэйтэд Прэс паведамляе, што 14 лістапада 15 грэчаскіх эсмінцаў пад камандай адмірала Кавадыуса зрабілі пераход праз Обранцкі праліў у Адрыятычнае мора. Эсмінцы дайшлі, не выявіўшы праціўніка, да вострава Сасено і вярнуліся на сваю базу.

Газета „Палітыкен" аб ваенных дзеяннях у Грэцыі

БЕЛГРАД, 19 лістапада. (ТАСС). Газета „Палітыкен" піша: „У канцы трэцяга тыдня грэка-італьянскай вайны сітуацыя на фронце вельмі змянілася. На працягу першага тыдня італьянскія войскі, карыстаючыся перавагай сіл, уварваліся на грэчаскую тэрыторыю ў цэнтры і на правым флангу. На працягу другога тыдня грэчаскія войскі, атрымаўшы падмацаванні ў разультаце мабілізацыі, спынілі наступленне італьянцаў і перайшлі ў контратаку. К канцу другога тыдня тэрыторыя ў раёне гор Пінд была вызвалена, і грэкі перасунулі свае пазіцыі на самую граніцу. На правым флангу грэкі з самага пачатку вайны ўмацаваліся на граніцы. У канцы трэцяга тыдня грэчаская армія прасунулася далей і заняла фронт вне грэчаскіх дзяржаўных граніц, ліквідавала аперацыі перайшла ў грэчаскія рукі. Грэчаскае контрнаступленне паспяхова прадаўжаецца.

Грэчаскія афіцыяльныя крыніцы сцвярджаюць, што англійскія паветраныя сілы безупынна бамбардыруюць транспарты італьянскіх войск і ваенных матэрыялаў. Парты ў Валоне і Санці-Кваранце разбураны".

Чуткі аб заходзе японскіх караблёў у Сайгон

ЛОНДАН, 19 лістапада (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр з Гонконга, згодна тых-жа вестак, японскія ваенныя караблёў і транспартных суднаў быццам увайшлі ў вусце ракі Сайгон (Інда-Кітай). Згодна тых-жа вестак, японцы прад'явілі генерал-губернатару Інда Кітая Доку патрабаванні прадаставіць ім права высадзіць войскі ў Сайгоне. Аб гэтым патрабаванні паведамлёна ў Вішы. Адказ пакуль не атрыман".

ПАВЕДАМЛЕННЕ

21 ЛІСТАПАДА Ў 6 ГАДЗІН ВЕЧАРА Ў ПАМЯШКАННІ ДОМА ПАРТАСВЕТЫ АДБУДЗЕЦЦА

Гарадскі сход рэдактараў, членаў рэдкалегій насценных газет і рабселькораў па пытанню:

„Задачы нізавога друку ў час агітацы[illegible] [illegible]андыдатаў у дэпутаты мясцовых Сове[illegible]

[illegible] КП(б)Б

РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ „ЗАРА" І АБЛАСНЫ [illegible]ВЫКАМІТЭТ.

З ленты тэлеграфа

Ва падставе „закона абароны Індыі" арыштаван бліжэйшы старонік Гандзі лідэр індыйскага нацыянальнага кангрэса Патэль і член індыйскага дзяржаўнага савета Віань.

* * *

Як паведамляе дацкая газета „Палітыкен", дацка-германская экспедыцыя, якая адправілася ва Ўсходнюю Грэнландыю для навуковых работ, захвачана канадскім экспедыцыйным судном і дастаўлена ў адну з канадскіх гаваней.

* * *

Іспанскі ўрад знуліраваў усе ліцэнзіі на ўвоз і вывад, выданыя да гэтага часу згодна гандлёваму пагадненню заключанаму з Англіяй.

* * *

На амерыканскім параходзе ў Шанхай прыбыла 177 амерыканскіх лёгчыкаў, якія накіроўваюцца ў Манілу для ўзмацнення абароны Філіпін.

* * *

У Ватыкане ўведзены картачкі на хлеб і на макароны: кожны жыхар будзе атрымоўваць па 300 грамаў хлеба ў дзень і па 2 кілграмы макарон у месяц.

* * *

Зараз Канада мае пад ружжом амаль столькі-ж салдатаў, колькі мела ў канцы вайны ў 1914 — 1918 гг. Ваенныя выдаткі Канады з лістапада 1939 года перавышаюць ваенныя выдаткі, зробленыя Канадай за 4 годы — з 1914 па 1918 г.

* * *

У Шанхаі 16 лістапада японскія ваенныя ўлады публічна пакаралі смерцю 4 кітайцаў, якія, як указваюць японцы, былі злоўлены ў часе крадзяжу тэлеграфных правадоў.

* * *

У сувязі з наступленнем халадоў у Шанхаі за апошнія два тыдні на вуліцах падабрана 1639 трупаў замерзшых людзей. (ТАСС)

Адказны рэдактар Г. Т. МІНЧУКОЎ

СЁННЯ Ў КІНОТЭАТРАХ

Кінатэатр „1-га МАЯ"
МУЗЫКАЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ

Кінатэатр імені ГОРКАГА
АГНІ ВЯЛІКАГА ГОРАДА

Даводзіцца да ведама ўсіх грамадзян гор. Бреста і раёніц, што

ЎСЕ МАГАЗІНЫ

гархарчпромгандля і сельпо раёнапажыўсаюзаў

АБАВЯЗАНЫ

куплянь парожнія бутэлькі з-пад водкі мацнапольнага ўзору

ПА НАСТУПНЫХ ЦЭНАХ:

1 літровая — 8 коп.
0,5 і 0,25 л. — 50 коп.
0,1 л. — 30 коп.

У выпадку адмовы ў прыёме бутэлек патрабуйце ў загадчыка магазіна кнігу скарг для ўнясення скаргі і звяніце па тэлефону № 216 Водачны завод.

Дырэкцыя.

Усе аптэкі і магазіны сангігіены

куплююць

аптэчную пасуду

(бутэлькі і банкі) розных памераў і ПРОБКІ ў неабмежаванай колькасці.

АПТЭКАЎПРАЎЛЕННЕ.

Брэсцкі РАЙТРАНСГАНДАЛЬХАРЧ

купляе легкавую машыну

Звяртацца з прапановамі: вул. Перацэ 1, тэл. 10

Брэсцкаму РАЙТРАНСГАНДАЛЬХАРЧУ

ПАТРАБУЮЦЦА

Аграном-гароднікавод, бухгалтар-рэвізор па гандлю, вартаўнікі.

Звяртацца: вул. Перацэ 1.

Адрэс рэдакцыі г. Брэст, вуліца імені Карла Маркса 29. Тэлефоны: адказнага рэдактара—1-17, нам. адказнага рэдактара — [illegible] чала пісем—6-15, аддзелы: эканамічны, партыйны і прапаганды — 1-23 і навучэя рэдакцыя — 7-11.